# Дарагія калегі!

**Ад усёй душы віншую вас з Днём народнай еднасці!**

Гэтае свята сімвалізуе яднанне народа, падкрэслівае пераемнасць пакаленняў, дачыненне кожнага з нас да лёсу Радзімы. Нам ёсць чым ганарыцца, у краіны багатае гістарычнае мінулае, а будучыня яе залежыць ад кожнага з нас. Толькі разам, аб'яднаўшы намаганні, мы зможам пераадолець любыя цяжкасці, вырашыць самыя складаныя задачы, змяніць жыццё да лепшага, забяспечыць дастойную будучыню нашым дзецям і ўнукам.

Сёння Беларусь з гонарам шануе свае традыцыі і ўпэўнена рухаецца наперад. Мы павінны памятаць, што толькі разам мы зможам дасягнуць нашай галоўнай мэты - дабрабыту, міру і згоды на нашай зямлі. У гэтае свята я жадаю ўсім нам міру і дабра, спакою ўнутры сябе, адзінства і згуртаванасці ў імя і на балазе нашай дзяржавы! Са святам!

